# АСАБЛІВАСЦІ СВЯТКАВАННЯ ДАЖЫНАК У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1920-1930 ГАДЫ
# FEATURES OF THE CELEBRATION OF DOZHINKI IN WESTERN BELARUS IN THE 1920-1930

Власюк Юрый Леанідавіч,
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: дажынкі, традыцыйная культура, абрад, свята, гарадское свята, міжваенны перыяд, Заходняя Беларусь, Польская Рэспубліка (1918-1939).

Рэзюмэ. Артыкул прысвечаны гісторыі святкавання дажынак у Заходняй Беларусі ў 20-30-х гг. ХХ ст. – падчас знаходжання рэгіёну ў складзе Другой Рэчы Паспалітай. Аўтар прасочвае асаблівасці святкавання традыцыйнага абраду ў сельскай мясцовасці, а таксама яго станаўлення ў якасці афіцыйнага, гарадскога свята міжваеннай Польшчы. Мэтай артыкула было прааналізаваць працэс трансфармацыі дажынак у згаданы час і ў дадзеным рэгіёне, а таксама разгледзець ход правядзення самога свята.

Keywords: dazhynki, traditional culture, rite, holiday, city holiday, interwar period, Western Belarus, Polish Republic (1918–1939).

Summary. The article is devoted to the history of the celebration of dazhynki in Western Belarus in the 1920s and 1930s XX century – while the region was part of the Second Polish Republic. The author traces the peculiarities of the celebration of the traditional rite in the countryside, as well as its formation as an official, city holiday of interwar Poland. The purpose of the article was to analyze the process of transformation of dazhynki at the mentioned time and in this region, as well as to consider the course of the holiday itself.

У традыцыйнай беларускай культуры дажынкі былі абрадам, якім скончвалася жніво. Абрад з'яўляўся часткай дахрысціянскага аграрнага комплексу, які часткова згубіў першапачатковы сэнс, аднак захаваў свой знешні выгляд да пачатку ХХ ст. [1, с. 81]. Пасля падзелу тэрыторыі Беларусі па выніках савецка-польскай вайны на Заходнюю і Усходнюю, у кожнай з яе частак дажынкі адзначаліся па-рознаму: так, на Усходзе яны, разам з іншымі абрадамі, былі прызнаныя антыпрагрэсіўнымі – іх трэба было замяніць прагрэсіўнымі, ідэалагічна правільнымі грамадзянскімі абрадамі; на Захадзе ж дажынкі працягвалі праводзіцца не толькі ў сельскай мясцовасці – менавіта тут яны сталі адзначацца ў якасці гарадскога свята (пазней, з

1990-х гг. традыцыя адзначэння дажынак у горадзе вярнулася, аднак ужо ў незалежнай Беларусі).

Да часу ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад міжваеннай Польшчы, а таксама ва ўвесь час знаходжання рэгіёну ў яе складзе, у сельскай мясцовасці дажынкі працягвалі праводзіцца такім чынам, як было прынята іх праводзіць на працягу стагоддзяў у беларускай традыцыйнай культуры (аднак падобным чынам дажынкі ў гэтыя гады працягвалі праводзіцца ўсё радзей).

Прымяркоўваліся дажынкі традыцыйна да 22–23 верасня – дзён восеньскага раўнадзенства [1, с. 81]. Заканчэнне жніва адзначалася вельмі ўрачыста: у апошні яго дзень па просьбе гаспадара поля збіралася талака, на якую прыходзілі суседкі гаспадара, яго родныя і сябры (а калі талака збіралася па патрабаванні пана, на яе прыходзіла амаль уся жаночая палова сельскай грамады) [2, с. 509].

Пачыналіся традыцыйныя дажынкі з размеркавання ўсіх жней найбольш паважанай з жанчын такім чынам, каб ніхто нікога не падганяў і не затрымліваў [3, с. 400]. У канцы працы кожная жнея адкладала каласок да адзінага дажыначнага снапа. Затым жнеі завязвалі сноп і выбіралі сярод сябе “Багіню”, на галаву якой апранаўся вянок з жыта, упрыгожаны кветкамі і стужкамі. “Багіні” у рукі ўручаўся сноп, пакрыты белым покрывам, пасля чаго шэсце накіроўвалася да дома гаспадара (альбо панскай сядзібы, у залежнасці ад таго, у чыёй уласнасці было поле). Гаспадар сустракаў шэсце хлебам-соллю, а наперад да яго выходзіла “Багіня”, кланяючыся гаспадару і кладучы ў яго ног сноп, які акрапляла святой вадой гаспадыня дома. Затым гаспадар браў сноп, кланяўся “Багіні”, услед за чым жнеі праходзілі ў дом – апошні сноп ставіўся на покуць, а на стол накрывалі стравы, у доме грала музыка, пачыналіся танцы [4, с. 26–27; 5].

Пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад міжваеннай Польшчы, роля падзеі заканчэння ўборкі ўраджаю прыкметна павысілася. У немалой ступені гэта было звязана са значнасцю сельскай гаспадаркі і саміх фермераў як сацыяльнай групы ў Польскай Рэспубліцы – акрамя таго, што жыхары вёскі ў 1930-я гг. складалі больш за 70% насельніцтва краіны, фермеры на палітычным полі былі прадстаўлены цэлымі партыямі, якія адстойвалі інтарэсы ўсяго сельскага насельніцтва дзяржавы [6].

Дзякуючы гэтаму традыцыйны абрад дажынак ў гэты час пастунова станавіўся чымсьці накшталт прафесійнага свята, якое адзначалася сялянамі, што з'яўлялася праявай іх сялянскага гонару ў якасці паспяховых фермераў [7].

Акрамя таго, у гэтыя ж гады Дажынкі ў выглядзе афіцыйнага свята сталі праводзіць прадстаўнікі дзяржаўных адміністрацый рознага ўзроўню. Ініцыятыва іх правядзення зыходзіла ад парафіяў, органаў мясцовага самакіравання і фермерскіх гурткоў, якія ўваходзілі ў склад Народнай партыі – найбуйнейшай польскай партыі, што адстойвала інтарэсы сялянства. Праводзіліся Дажынкі, адпаведна, на ўзроўні парафій, гмін, паветаў і нават ваяводстваў. Часта свята сумяшчалася з сельскагаспадарчымі выставамі, фестывалямі і выступленнямі народных калектываў [8; 9].

Вышэйшым звяном у святкаванні Дажынак з 1927 г. стала правядзенне Прэзідэнцкіх Дажынак, якія ладзіліся да 1938 г. у курортным пасёлку Спала (Лодзінскае ваяводства). Традыцыя іх правядзення была перапыненая з пачаткам вайны (аднак яна адрадзілася ў 2000 г.). Дажынкі ў Спале, узятыя пад асабісты патранат прэзідэнта Ігнацыя Масціцкага, насілі агульнанацыянальны характар – іх

наведвалі фермерскія дэлегацыі з усёй краіны, а колькасць іх удзельнікаў у розныя гады дасягала ад 10 да 40 тыс. чалавек. Гэты фестываль працягваўся на працягу трох дзён, уключаючы ў сябе імшу (з якой у першы дзень пачыналіся ўрачыстасці), святочнае шэсце дэлегацый (што пасля выступу прэзідэнта дарылі яму святочныя вянкі), а таксама народныя гульні і танцы, якія суправаджаліся гукамі некалькіх аркестраў. Вянчалася святкаванне святочным феерверкам [10].

Як было адзначана вышэй, акрамя парафіяў і гмін, свята Дажынак у 1920–30-я гг. праводзілася на ўзроўні паветаў і нават ваяводстваў, стаўшы, такім чынам, адным з гарадскіх святаў Польскай Рэспублікі. Да нашых дзён захаваўся багаты фотаматэрыял, на якім адлюстравана святкаванне Дажынак у такіх заходнебеларускіх павятовых цэнтрах, як Глыбокае і Кобрын, а таксама ў цэнтры Палескага ваяводства – Брэсце-над-Бугам. На аснове дадзенага фотаматэрыялу ўяўляецца магчымым разгледзець ход і асаблівасці правядзення Дажынак.

Таксама цікавасць уяўляе той факт, што Дажынкі 1920–30-х гг., што праводзіліся ў Заходняй Беларусі, за некаторымі выключэннямі вельмі нагадваюць ходам свайго правядзення сучасны беларускі фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла “Дажынкі” на ўсіх узроўнях яго правядзення.

Так, Дажынкі таго часу пачыналіся з правядзення святочнай імшы. Пасля гэтага па галоўнай вуліцы альбо плошчы горада пачыналася шэсце дэлегацый гмін альбо паветаў (у выпадку з павятовымі і ваяводскімі Дажынкамі адпаведна) [11; 12]. Акрамя прадстаўнікоў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, у шэсці калоны ўдзельнічалі прадстаўнікі розных арганізацый, напрыклад Фермерскага альбо Стралковага Саюзаў [13; 14]. Таксама ў шэсці прымалі ўдзел дэлегацыі асаднікаў, прадстаўленыя, у асноўным, іх жонкамі і дзецьмі [15].

Практычна ўсе ўдзельнікі дажыначнага шэсця былі апранутыя ў традыцыйныя беларускія ці польскія касцюмы. У пачатку калон, у асноўным, ішлі маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія неслі герб Другой Рэчы Паспалітай, увенчаны кветкамі, каласамі збожжавых і бела-чырвонымі стужкамі (мал. 1) [16]. Каля іх ішлі прадстаўнікі хораў і музычных калектываў з музычнымі інструментамі (мал. 1) [17]. Сярэдзіну калоны займалі сяляне з прыладамі сваёй працы – косамі, цэпамі і граблямі [18]. У канцы калоны ішлі сяляне з сохамі, баронамі і плугамі, а таксама буйной хатняй жывёлай [19].

Пасля праходжання калон іх прадстаўнікі падыходзілі да работнікаў адміністрацый (сярод якіх быў таксама “дажыначны стараста”), што займалі цэнтральнае месца каля адміністрацыйных будынкаў альбо на плошчы, падносячы ім святочныя вянкі і вялікія боханы хлеба ці караваі [20]. Пасля гэтага афіцыйная частка свята падыходзіла да канца – пачыналіся народныя гульні і танцы, а потым усе ўдзельнікі ўрачыстасці садзіліся за святочны стол, які размяшчаўся, часцяком, проста ў цэнтры плошчы [21; 22].




*Мал. 1* Члены дэлегацыі ад гміны Празарокі і ўдзельнікі народнага ансамбля са жніўным вянком. Глыбокае. 1934 г. [17].

Такім чынам, у гады знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы традыцыйны абрад дажынак працягваў праводзіцца. У той жа час, пры садзейнічанні фермерскіх аб'яднанняў і адміністрацый рознага ўзроўню пачалося правядзенне дажынак ў якасці афіцыйнага, гарадскога свята – Дажынкі ў гэтыя гады праводзіліся ў цэнтрах парафіяў, гмін, паветаў і ваяводстваў. Цэнтральным звяном у іх святкаванні былі Прэзідэнцкія Дажынкі ў Спале.

Цікава таксама адзначыць той факт, што Дажынкі 1920–30-х гг. як па ходзе, так і па этапах свайго правядзення вельмі нагадвалі сучасны беларускі фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла “Дажынкі”.

Літаратура

1. Доманская, А. И. Дожинки по-белорусски: от ритуала к карнавалу / А. И. Доманская // Вестник Нижегородского университета им. Н. И. Лобачевского / Серия Социальные науки. – Н. Новгород, 2013. – № 1 (29). – С. 81–87.
2. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В. М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мн.: Бел. Навука, 2002. – 606 с.: іл.
3. Белорусы / Отв. ред. В. К. Бондарчик, Р. А. Григорьева, М. Ф. Пилипенко. Серия «Народы и культуры». – М.: Наука. 1998. – 503 с.: ил.
4. Шпилевский, П. Обряды поселян Витебской и Минской губерний при уборке хлеба с полей / П. Шпилевский // Пантеон. – СПб. – 1853. – Т. 9, кн. 6. – С. 19–27.
5. Dożynki – święto we wsi i we dworze [Electronic resource] // Muzeum Etnograficzny w Rzeszowie. – Mode of access: http://muzeumetnograficzne.rzeszow.pl/stara/node/282. – Date of access: 07.06.2021.
6. Statystyka w II Rzeczypospolitej [Electronic resource] // Niepodległa – stulecie odzyskania niepodległości. – Mode of access: https://niepodlegla.gov.pl/o-niepodleglej/statystyka-w-ii-rzeczypospolitej/. – Date of access: 07.06.2021.
7. Dożynki tradycje i obyczaje – święto zbiorów w Polsce i na świecie [Electronic resource] // Blog podróżniczy Nasze Szlaki. – Mode of access: https://www.naszeszlaki.pl/archives/43908. – Date of access: 07.06.2021.

8. Historia dożynek: Obrzędy i zanikająca tradycja [Electronic resource] // Gazeta Średzka. Portal mieszkańców powiatu średzkiego. – Mode of access: http://gazetasredzka.pl/aktualnosci/historia-dozynek-obrzedy-i-zanikajaca-tradycja,a11481c1. – Date of access: 07.06.2021.
9. Dożynki – słowiańskie Święto Plonów [Electronic resource] // Historia zapomniana i mniej znana. – Mode of access: https://historiamniejznanaizapomniana.wordpress.com/2015/09/23/dozynki-slowianskie-swieto-plonow/. – Date of access: 07.06.2021.
10. Z Historii Dożynek Prezydenckich [Electronic resource] // Oficjalna strona Prezydenta Rzeczypospolitej Polskiej. – Mode of access: https://www.prezydent.pl/kancelaria/dozynki/dozynki-prezydenckie/historia/. – Date of access: 07.06.2021.
11. Свята дажынак на Банкаўскай плошчы (пл. 700-годдзя Кобрына), 1936 г. (КП-4940) // Кобринский военно-исторический музей имени Александра Васильевича Суворова.
12. Dożynki w Brześciu nad Bugiem (pochód dożynkowy) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75509/9de4b28823a0b2f4a9fcad2f24333037/. – Date of access: 09.06.2021.
13. Dożynki w Brześciu nad Bugiem (członkinie Koła Gospodyń Związku Rolniczego niosące wieniec dożynkowy) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75543/9de4b28823a0b2f4a9fcad2f24333037/. – Date of access: 09.06.2021.
14. Dożynki w Brześciu nad Bugiem (przedstawiciele miejscowego oddziału Związku Strzeleckiego niosą w pochodzie wieniec dożynkowy) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75551/9de4b28823a0b2f4a9fcad2f24333037/. – Date of access: 09.06.2021.
15. Dożynki w Brześciu nad Bugiem (osadniczka ze swoimi dziećmi niosąca wieniec dożynkowy z napisem Związek Rolniczy) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75526/9de4b28823a0b2f4a9fcad2f24333037/. – Date of access: 09.06.2021.
16. Dożynki w Głębokiem (jedna z delegacji składa wieniec dożynkowy) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75831/65fdd2e9445e3bdff88ad53f323f6dd1/. – Date of access: 09.06.2021.
17. Dożynki w Głębokiem (członkowie delegacji z gminy Prozoroki z wieńcem dożynkowym. Widoczni także członkowie kapeli ludowej) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75907/65fdd2e9445e3bdff88ad53f323f6dd1/. – Date of access: 09.06.2021.
18. Dożynki w Głębokiem (chłopi z kosami w pochodzie) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75877/65fdd2e9445e3bdff88ad53f323f6dd1/. – Date of access: 09.06.2021.

19. Dożynki w Głębokiem (chłopi białoruscy z bronami) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75900/65fdd2e9445e3bdff88ad53f323f6dd1/. – Date of access: 09.06.2021.
20. Dożynki w Głębokiem (delegacja rolników składa staroście jako dar dożynkowy duży bochen chleb) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75825/65fdd2e9445e3bdff88ad53f323f6dd1/. – Date of access: 09.06.2021.
21. Dożynki w Głębokiem (chłopi białoruscy podczas tańca) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/75904/65fdd2e9445e3bdff88ad53f323f6dd1/. – Date of access: 09.06.2021.
22. Dożynki poleskie w Kobryniu (uczestnicy dożynek podczas uroczystego obiadu) [Electronic resource] // Zbiory NAC online. – Mode of access: https://audiovis.nac.gov.pl/obraz/76000/9de4b28823a0b2f4a9fcad2f24333037/. – Date of access: 09.06.2021.